# Барока, ракако і класіцызм у мастацтве XVII–XVIII стагоддзяў



Так пусть же будет смысл всего дороже вам,
Пусть блеск и красоту лишь он даёт стихам!..

*Нікола Буало*

**Джавані Ларэнца Берніні.** Плошча Святога Пятра ў Рыме, Італія (XVII ст.)

## § 21. Пышнае барока: тэатральнасць ва ўсім

Вялікія навуковыя адкрыцці — у геаграфіі, астраноміі, медыцыне — на рубяжы XVI—XVII стагоддзяў разбурылі рэнесансныя ўяўленні пра гарманічнае ўпарадкаванне навакольнага свету. Вызначаліся новыя тэрытарыяльныя межы, новыя культурныя сувязі. Свет пачаў здавацца чалавеку зменлівым і надзвычай складаным для разумення…

**Што такое барока?** Крушэнне ідэалаў Адраджэння спрыяла ўзнікненню мастацкага стылю *барока*, які па-новаму выразіў кантрасты і парадоксы эпохі. З'явіўшыся першапачаткова ў Італіі ў XVII стагоддзі, гэты стыль паступова распаўсюдзіўся і ў астатніх еўрапейскіх краінах.

Новае стаўленне да свету і чалавека вызначыла асноўныя рысы барока. Вера ў бязмежныя магчымасці чалавека змянілася песімізмам і глыбокімі сум-

…В орнаменте витом увидишь тут и там
Победоносный шлем и вазы фимиам,
Колонны, капитель, пилястры и аркады
Увидишь всюду ты, куда ни кинешь взгляды,
Амуры, вензеля, вплетённые тайком…

*Жорж дэ Скюдзеры (пераклад Л. Тарахоўскай)*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Андрэа Поца.**
Роспіс скляпенняў
у царкве Сант-Іньяцыа
ў Рыме, Італія
(2-я палова XVII ст.)



неннямі ў яго высокім прызначэнні. Не маючы даверу да розуму, людзі пачалі шукаць адказы на пытанні быцця, што цікавілі іх, у рэлігіі і мастыцы. Невыпадкова французскі навуковец Блез Паска́ль параўноўваў чалавека з «думаючым трыснягом, які вагаецца ад кожнага ветру быцця». У ілюзорнай, зменлівай і вірлівай плыні падзей чалавек адчувае сябе вельмі разгубленым.

Значэнне слова «барока» — «няправільны», «скажоны», «мудрагелісты» — толькі часткова раскрывае асаблівасці мастацтва гэтага перыяду. Стыль барока не проста адлюстроўваў у мастацкай культуры сумненні і супярэчнасці эпохі. Ён *здзіўляў* сваімі мудрагелістымі, гратэскнымі, фантастычнымі вобразамі. Роспісы і скульптура, асвятленне і музыка павінны былі ствараць атмасферу своеасаблівай тэатральнай пастаноўкі. Кантраснасць, дэкаратыўнасць і дынамічнасць вобразаў, імкненне да велічы і пышнасці, сумяшчэнне рэальнасці і ілюзіі... Усе гэтыя рысы барока служылі галоўнай мэце — выклікаць у гледачоў і слухачоў яскравыя эмоцыі.

Англійскі паэт Аляксандр Поўп пра мастацтва барока пісаў: «Цель мастера — контрастами играть, скрывать границы, взоры удивлять…» Якая важная асаблівасць мастацтва барока падкрэсліваецца ў радках верша XVIII стагоддзя?

**Відовішчнасць архітэктуры.** Для пабудоў у стылі барока архітэктары выкарыстоўвалі складаны план, у якім спалучаліся адразу некалькі геаметрычных фігур. Фасады будынкаў рэдка выстройваліся па прамой, як у эпоху Адраджэння. Малюнак *франтонаў* барочных пабудоў «скрыўляецца», і хваля сцяны нібы імкнецца выйсці за межы будынка. Таксама для збудаванняў барока характэрнае кантраснае спалучэнне строгіх вертыкалей калон са складанай пластычнай прапрацоўкай паверхні сцяны. Фасады маюць шматлікія выступы і паглыбленні, якія выразна падкрэсліваюцца ценямі. Звонку і ўнутры будынкі ўпрыгожвае буйны і складаны дэкор, напрыклад валю́ты.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Франчэска Бараміні.** Царква Сан-Карла але Куатра Фантанэ ў Рыме, Італія (1638—1677 гг.)



Невялікая царква *Сан-Ка́рла але Куа́тра Фанта́нэ* ў Рыме выяўляе стыль барока найбольш эфектным і выразным чынам. Вуглы будынка зрэзаны, а каля іх размешчаны чатыры скульптурныя групы з фантанамі — адсюль і назва. Фігуры анёлаў падтрымліваюць авальны шчыт, які некалі ўпрыгожвала фрэска на сюжэт Святой Тройцы. Увагнутыя і выпуклыя сцены фасада задаюць хвалісты рух усёй вуліцы, дзе размешчаны храм.

Разгледзьце царкву Франчэска Бара́міні ў параграфе і на дадатковай старонцы. Падбярыце ў інфармацыйных крыніцах выявы збудаванняў, якія маюць авалы і ў плане, і ў дэкоры. Дакажыце на аснове гэтых прыкладаў, што авал быў улюбёнай фігурай італьянскіх архітэктараў барока.



**Прасторавыя ілюзіі жывапісу.** У жывапісе таксама пастунова складваліся асноўныя рысы барока. Надаючы вялікую ўвагу дынаміцы, жывапісцы ўслед за архітэктарамі шукалі для яе перадачы свае мастацкія прыёмы. Напрыклад, з дапамогай кантрасту — рэзкага адрознення паміж святлом і ценем — буйныя, ілюзорна аб'ёмныя формы як бы выступалі над плоскасцю фону, становячыся яркімі і выразнымі. Драматызм у жывапісных работах дасягаўся дзякуючы спецыфічнаму «тэатральнаму» асвятленню. Святло,

**Пітэр Паўль Рубенс.** Апафеоз Іакава I. Карціна на столі Банкетнай залы Уайтхольскага палаца ў Лондане, Англія (1635 г.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

адлюстраванае майстрам, падобна да святла пражэктараў на сцэне, выхоплівае з цемры фрагменты карціны, найбольш важныя для ўспрымання.

У рабоце *«Апафеоз Іа́кава І»* нідэрландскі мастак *Пі́тэр Паўль Ру́бенс* услаўляе каралеўскую ўладу. У жывапісным «апавяданні» пра дабрачыннасці караля Іакава І і ў алегарычным усхваленні яго праўлення шмат жыццёвых дэталей. Паставы людзей натуральныя, фактура тканін і тэкстура аблокаў паказаны праўдзіва. Дзякуючы перадачы рэзкага ракурсу мастак стварыў ілюзію фігур, якія высока лунаюць у нябёсах.

Разгледзьце ў параграфе і на кампакт-дыску палотны П. П. Рубенса. На гэтых прыкладах дакажыце іх прыналежнасць да стылю барока.

**Бязмежныя фантазіі ў скульптуры.** У эпоху барока скульптура была вельмі запатрабаваным відам мастацтва. Скульптурай упрыгожвалі палацы і храмы, яе размяшчалі ў парках і на гарадскіх плошчах. У скульптурныя кампазіцыі з мноствам падрабязных дэталей майстры часта дадавалі фігуркі *пу́ці* — амураў. Прыёмы тэатралізацыі пранікаюць і ў гэты від мастацтва: паставы і жэсты персанажаў дынамічныя, выразныя і ўмоўныя, як гульня акцёраў на сцэне.

*Алтар Луі́джы Ганза́га ў рымскай царкве Сант-Іньяцыа* выкананы з разнастайных матэрыялаў. Французскі скульптар *П'ер Ле Гро Малодшы*, выкарыстоўваючы мастацкія магчымасці рознага па колеры і фактуры каменю, для яшчэ большай эфектнасці дэкору дадаў пазалоту. Складаная кампазіцыя інтэр'ера храма, вядома ж, уражвала вернікаў. У гэтай рабоце дзіўным чынам злучыліся і круглая скульптура, і рэльефы, і архітэктурныя дэталі. Так майстры барока стваралі атмасферу пышнасці і раскошы.



**П'ер Ле Гро Малодшы.** Алтар Луіджы Ганзага ў царкве Сант-Іньяцыа ў Рыме, Італія (пачатак XVIII ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Разгледзьце ўважліва форму калон у алтары царквы Сант-Іньяцыа. Што яны вам нагадваюць? Якога эфекту хацеў дасягнуць мастак, выкарыстоўваючы падобную форму калон?

Стыль барока быў звязаны з імкненнем царквы ў дзівосных і экспрэсіўных формах умацаваць свой прэстыж і ўплыў у дзяржаве. Помнікі барока стваралі ўражанне грандыёзнасці і хараства дзякуючы адначасоваму ўздзеянню дынамічных форм архітэктуры, пышнасці скульптуры, рэалістычнасці жывапісу, прадуманай гульні колеру і святла ў інтэр'еры.

## Пытанні і заданні

1. Разгледзьце творы мастацтва эпохі барока, прадстаўленыя ў падручніку, і запоўніце табліцу.

| | |
|---|---|
| Пераважныя колеры | |
| Лініі, абрысы, формы: у скульптуры і архітэктуры | |
| Характэрныя элементы інтэр'ера | |
| Характэрныя архітэктурныя элементы і дэкор фасадаў пабудоў | |
| Асноўнае ўражанне ад работ | |

2. Тэрмін «барока» ў яго сучасным значэнні з'явіўся не адразу. Спачатку гэтым словам называлі жамчужыну няправільнай формы. Затым яно стала сінонімам усяго недарэчнага, абсурднага. Яшчэ пазней словам «барока» сталі пазначаць праявы дрэннага густу. Як гэтыя значэнні слова звязаныя з імкненнем здзіўляць, уласцівым мастакам барока?

3. У 5-м класе вы ўжо пазнаёміліся з выявай-падманкай, вывучаючы тэму «Пра што распавядае мастак?». Успомніце і назавіце гэтую работу. У чым заключаецца эфект «падману»?

2 4. Знакаміты італьянскі мастак Джавані Ларэнца Берніні казаў: гэта «ёсць найвышэйшае дасягненне майго разца, якім я перамог мармур і зрабіў яго гнуткім, як воск, і гэтым змог да вядомай ступені аб'яднаць скульптуру з жывапісам». Як вы думаеце, што меў на ўвазе аўтар? Патлумачце сваё меркаванне з дапамогай работы гэтага майстра, прадстаўленай на дадатковай старонцы.

3 5. Рысы барока знайшлі адлюстраванне і ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Прачытайце на дадатковай старонцы пра вырабы майстроў барока. Якое ўражанне зрабіла на вас мэбля французскага майстра?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Творчая майстэрня**

6. Разгледзьце ў інфармацыйных крыніцах карціну «Падрабязней за струны» («Подробнее струн») сучаснага беларускага жывапісца Рамана Заслонава. Работы мастака ўтрымліваюць многія характарыстыкі мастацтва барока. Яго палотны напоўнены насычанымі кантраснымі колерамі і дэталямі, у кампазіцыі карцін адчуваецца рух... А тэатральнасць праяўляецца ў тым, што персанажы на палотнах нібы ўдзельнічаюць у інтрыгоўнай п'есе: выступаюць самі і гледачамі, і акцёрамі. Якія яшчэ агульныя рысы ў стылістыцы работ Р. Заслонава і барочных мастакоў вы можаце адзначыць?

## § 22—23. Мастацтва Італіі: калыска барока

Цэнтр развіцця італьянскага барочнага мастацтва — горад Рым. Архітэктары барока парываюць з ураўнаважанасцю Адраджэння. Яны аддаюць перавагу невычэрпнай фантазіі пластыкі і дэкору.

**Барочны Рым — тэатр пад адкрытым небам.** У нашы дні горад Рым лічыцца музеем і тэатрам пад адкрытым небам. У ім можна сустрэць самых розных «персанажаў»: трохтысячагадовая гісторыя развіцця культуры і мастацтва пакінула тут прыкметныя сляды — ад Антычнасці да Новага часу.

Бацькам барока называюць італьянскага майстра *Джавані Ларэнца Берніні.* Ён валодаў універсальным талентам: праектаваў цэрквы, фантаны, плошчы; ствараў скульптурныя партрэты і алтары; працаваў як сцэнічны мастак і інжынер. На працягу многіх гадоў майстар з'яўляўся фаварытам папы рымскага, і дзякуючы гэтаму яму ўдалося пакінуць нашчадкам унікальную спадчыну.

Адзін з выдатных твораў Берніні — *фантан «Чатырох рэк»*. Калі ў эпоху Адраджэння ў цэнтры гарадскіх плошчаў размяшчаліся статуі, то ў эпоху барока — абеліскі ці фантаны. Менавіта для аздаблення плошчы перад палацам сямейства Памфілі і быў узведзены фантан. У яго цэнтры знаходзіцца абеліск рымскага імператара Карака́лы, а абрамляюць фантан фігуры, што сімвалізуюць рэкі: Дунай, Ніл, Ганг і Ла-Плату. Фігура, якая ўвасабляе духа ракі Дунай, трымае ў руках фамільны герб заказчыка — Папы Рымскага Інакенція X. Скульптурныя выявы чатырох рэк паказаны ў асяроддзі прадстаўнікоў фаўны кантынентаў, па тэрыторыі якіх яны цякуць, — змея, льва, каня і дэльфіна. У дэкоры фантана мы бачым і раслінныя матывы: вінаградную лазу, галіны пальмы, садавіну і кветкі.

У сярэдзіне XVII стагоддзя архітэктар стварыў *плошчу перад саборам Святога Пятра* (с. 110), якая складаецца з дзвюх частак — авальнай і трапецападобнай, «нанізаных» на адзіную з саборам вось. Авальную ў плане плошчу апярэзвае каланада. Верхняя частка каланады ўпрыгожаная скульптурай — фігурамі святых. Форма авала ўжывалася ў праектаванні плошчаў упершыню. Але яна надавала адчуванне некаторай няўстойлівасці прасторы. Каб пазбегнуць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне